**ЗАКЛЮЧЭННЕ**
савета па абароне дысертацый Д 02.21.03
пры БДПУ па дысертацыі Сямашка Надзеі Канстанцінаўны
**«Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)»,**
прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання

**Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджаецца вучоная ступень.** Савет па абароне дысертацый Д 02.21.03 адзначае, што дысертацыя Н.К. Сямашка **«Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)»** адпавядае спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання і галіне навукі – гістарычныя.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў вырашэнне навуковай задачы з ацэнкай яе значнасці.** Упершыню ў беларускай гістарычнай навуцы выяўлены канцэптуальныя падыходы, тэндэнцыі і асаблівасці пры вывучэнні аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг., уласцівыя гістарыяграфіі Расійскай імперыі (этнаграфічная накіраванасць, апісальнасць падзей і працэсаў пры мінімальнай колькасці выкарыстаных дакументальных крыніц), савецкага перыяду (абсалютызацыя марксісцка-ленінскай метадалогіі з мэтай абгрунтавання непазбежнасці крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы і заканамернага скасавання прыгоннага ладу, характарыстыка зараджэння элементаў капіталізму як комплекснай праблемы, якая ўключала сацыяльна-эканамічныя, класавыя і палітычныя аспекты), а таксама навуковым публікацыям у Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі (пераасэнсаванне вынікаў даследаванняў савецкага перыяду на падставе новых метадалагічных падыходаў – мадэрнізацыйнай тэорыі, метадаў мікрагісторыі, гісторыі паўсядзённасці, антрапалагічнай і гендэрнай гісторыі), на падставе чаго абгрунтавана аўтарская перыядызацыя гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850- х гг.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку прысуджана вучоная ступень.** Улічваючы актуальнасць, навуковую навізну, практычную і сацыяльную значнасць даследавання, саіскальніку Н.К. Сямашка прысуджана вучоная ступень кандыдата гістарычных навук за:

– распрацоўку і абгрунтаванне перыядызацыі гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – 1850-х гг.: 1) гістарыяграфія Расійскай імперыі (другая палова XIX ст. – 1917 г.); 2) гістарыяграфія савецкага перыяду (1917–1991 гг.) з вылучэннем у ім пяці этапаў; 3) гістарыяграфія Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі (1992–2023 гг.) на падставе ўстанаўлення сутнасных змен у падыходах, метадах і формах прадстаўлення вынікаў даследаванняў на кожным з гэтых этапаў;

– выяўленне зместу і асаблівасцей гістарычных даследаванняў аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. у Расійскай імперыі, для якіх характэрнымі з'яўляліся павярхоўны аналіз сацыяльна-эканамічных праблем, наданне прыярытэту палітычнай і канфесійнай гісторыі, апісальнасць падзей і працэсаў, ігнараванне навуковых тлумачэнняў;

– устанаўленне характэрных рысаў і спецыфікі ў вывучэнні аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. перыяду савецкай дзяржавы (пашырэнне праблематыкі на аснове марксісцка-ленінскай метадалогіі, увядзенне ў навуковы ўжытак новых дакументальных крыніц, перанос агульнарасійскіх характарыстык сацыяльна-эканамічнага развіцця на беларускую рэчаіснасць, перабольшванне ўзроўню і тэмпаў укаранення элементаў капіталізму ў сельскай гаспадарцы і глыбіні крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы, наданне прыярытэту класавай барацьбе сялянства з прыгоннікамі);

– абгрунтаванне таго, што ў працах гісторыкаў-аграрнікаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі адбываюцца пераасэнсаванне напрацовак савецкага перыяду, аналіз гістарычнай рэчаіснасці з улікам новых метадалагічных падыходаў – выкарыстанне метадаў мікрагісторыі, гісторыі паўсядзённасці, гендэрнай і антрапалагічнай гісторыі, тэорыі мадэрнізацыі, што пашырае і паглыбляе праблемнае поле гістарычнай навукі;

– вызначэнне перспектыўных напрамкаў даследаванняў па аграрнай праблематыцы канца XVIII ст. – 1850-х гг.: палітыка расійскага ўрада ў сферах фінансава-крэдытнай сістэмы і падаткаабкладання, развіццё шляхоў зносін і ўплыў тэхнічнага перавароту ў прамысловасці на крызіс феадальных адносін, характар эканамічных узаемасувязей паміж горадам і вёскай, што напрамую ці ўскосна ўплывалі на эвалюцыю сацыяльна-эканамічных адносін у аграрным сектары эканомікі.

**Рэкамендацыі па выкарытсанні вынікаў даследавання.** Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны ў адукацыйным працэсе ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь, пры напісанні курсавых і дыпломных работ, а таксама падрыхтоўцы магістарскіх дысертацый. Высновы і палажэнні, якія выносяцца на абарону, могуць быць запатрабаванымі пры падрыхтоўцы лекцыйных і спецыяльных курсаў па гістарыяграфіі, аграрнай гісторыі, напісанні вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў, абагульняючых навуковых прац па гісторыі Беларусі і Расіі.

Старшыня савета
па абароне дысертацый — А.П.Жытко

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый — А.А.Сурма
18.12.2024